УДК 940.5(476)

# Уплыў польскай і савецкай адукацыйнай палітыкі на беларускую школьную справу ў 1919–1921 гг.

**Трубчык А.Г.**

***Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт", Мінск***

*У гістарыяграфіі застаюцца адкрытымі пытанні ўплываў адукацыйнай палітыкі на развіццё беларускай адукацыі ў перыяд польска-савецкай вайны (1919–1921 гг.), адсутнічае колькасная характарыстыка навучальных устаноў, не вызначана роля нацыянальнай інтэлігенцыі ў развіцці беларускай школьнай справы і інш.*

*Мэта даследавання – прааналізаваць і параўнаць уплыў адукацыйнай палітыкі як польскай, так і савецкай улады на стан беларускай школьнай справы ў 1919–1921 гг.*

***Матэрыял і метады.*** *Артыкул падрыхтаваны па матэрыялах, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, а таксама фондзе Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх зямель (ГУУЗ), што знаходзіцца ў аддзеле рукапісаў і старадрукаў Варшаўскай публічнай бібліятэкі. Метадалагічную аснову вывучэння праблемы склалі прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці, сістэмнасці. Былі скарыстаны гістарычна-генетычны, гістарычна-тыпалагічны і параўнальна-гістарычны метады.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Ва ўмовах польска-савецкай вайны РСФСР і Польшча выкарыстоўвалі беларускую нацыянальную адукацыю як адзін з інструментаў ваенна-палітычнай і ідэалагічнай барацьбы. Пры дапамозе ўступак у галіне адукацыі і культуры палякі стараліся тактычна абмінуць вырашэнне пытання аб беларускай дзяржаўнасці. Аднак польскае кіраўніцтва недаацэньвала беларускіх лідараў, якія прадэманстравалі здольнасць да хуткай арганізацыі нацыянальнай культурна-асветніцкай працы. Расчараванне беларускіх дзеячаў вынікамі польскай палітыкі ў ліпені 1920 г. было выкарыстана савецкай уладай для прыцягнення іх на свой бок.*

***Заключэнне.*** *У час польска-савецкай вайны (1919–1921 гг.) кіраўніцтва РСФСР і Польшчы дэкларавалі стварэнне школ з беларускай мовай навучання, аднак аб'ектыўна не былі зацікаўлены ў развіцці нацыянальнай школы беларусаў, якая з'яўлялася крыніцай пашырэння нацыянальнай свядомасці і важнейшым фактарам на шляху да станаўлення ўласнай дзяржаўнасці.*

***Ключавыя словы:*** *беларуская школьная справа, адукацыйная палітыка, польска-савецкая вайна (1919–1921 гг.).*

*(Ученые записки. – 2016. – Том 21. – С. 47–53)*

# Impact of Polish and Soviet Educational Policy on Belarusian School Affairs in 1919–1921

**Trubchyk A.H.**

***Educational Establishment "Belarusian State Agrarian Technical University", Minsk***

*The impact of the educational policy on the development of Belarusian education during the Polish-Soviet war in 1919–1921 is a questionable item in the historiography. There is no statistics of educational establishments, the role of national intellectuals in the development of Belarusian school system is not determined.*

*The aim of the research is to analyze and compare the impact of education policy of both Polish and Soviet power on the status of Belarusian school affairs in 1919–1921.*

***Material and methods.*** *The basis of the article is the materials of the funds in the National Archive of the Republic of Belarus, The State Archive of Minsk Region, the State Archive of Grodno Region. The methodological basis of this problem is made up by historical, objective and system principles. The historic-genetic, historic-typological, comparative-historic methods were used.*

***Findings and their discussion.*** *In the conditions of the Polish-Soviet War Russia and Poland used Belarusian national education as an instrument of political and ideological struggle. Having achieved some concession in education and culture the Polish tried carefully to avoid the question of the Belarusian statehood. However, Polish administration underestimated Belarusian leaders, who demonstrated the organizational possibility of national cultural-educational work. Disappointment of the Belarusian activists with Polish policy in July of 1920 was used by the Soviet administration to entice them.*

***Conclusion.*** *During the Polish-Soviet War in 1919–1921 both Russian and Soviet authorities declared foundation schools with the Belarusian language of teaching. However, objectively, both of them were not interested in the development of national Belarusian schooling because it became a source of expansion of national consciousness and an important factor of the establishment of Belarusian own state.*

***Key words:*** *Belarusian school system, educational policy, the Polish-Soviet War in 1919–1921.*

*(Scientific notes. – 2016. – Vol. 21. – P. 47–53)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* lenadaschkewich@tut.by – **А.Г. Трубчык**

Праблема развіцця беларускай школьнай адукацыі на тэрыторыі Беларусі ў час польска-савецкай вайны (1919–1921 гг.) не знайшла ўсебаковага і комплекснага асвятлення ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Сучасныя айчынныя даследчыкі вывучаюць беларускую школьную справу ў кантэксце такіх пытанняў, як станаўленне беларускай дзяржаўнасці і развіццё беларускага нацыянальнага руху (Р.Р. Лазько, А.М. Літвін, М.П. Касцюк, А.В. Ціхаміраў, А.М. Чарнякевіч і інш.) [1, с. 92]. Разам з тым не дадзена аб'ектыўная гістарычная ацэнка ўплываў адукацыйнай палітыкі як савецкай, так і польскай улады на развіццё беларускай адукацыі, адсутнічае колькасная характарыстыка навучальных устаноў, дыскусійным застаецца пытанне аб ролі нацыянальнай інтэлігенцыі ў развіцці беларускай школьнай справы, не вызначаны фактары, якія ўплывалі на фарміраванне адносін мясцовага насельніцтва да школ з беларускай мовай навучання і інш.

Вывучэнне беларускага пытання ў польскай гістарыяграфіі зыходзіць з падтрымкі тагачаснай адукацыйнай палітыкі (Ю. Тамашэўскі, Ю. Героўская-Калаўр, В. Сляшынскі, М. Семаковіч) [1, с. 93]. У шэрагу навуковых публікацый заніжаюцца нацыянальна-культурныя і дзяржаватворчыя імкненні і здольнасці тагачаснай беларускай інтэлігенцыі і самога мясцовага насельніцтва.

Мэта даследавання – прааналізаваць і параўнаць уплыў адукацыйнай палітыкі як польскай, так і савецкай улады на стан беларускай школьнай справы ў 1919–1921 гг.

**Матэрыял і метады.** Артыкул падрыхтаваны па матэрыялах, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, а таксама фондзе Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх зямель, што знаходзіцца ў аддзеле рукапісаў і старадрукаў Варшаўскай публічнай бібліятэкі.

Метадалагічную аснову вывучэння праблемы склалі прынцыпы гістарызму, аб'ектыўнасці, сістэмнасці. Быў скарыстаны гістарычна-генетычны метад, пры дапамозе якога вызначана дынаміка ажыццяўлення адукацыйнай палітыкі на беларускай тэрыторыі ў залежнасці ад шэрагу ўнутрыпалітычных і знешнепалітычных фактараў. Гістарычнатыпалагічны і параўнальна-гістарычны метады дазволілі параўнаць уплыў адукацыйнай палітыкі польскіх і савецкіх улад на развіццё нацыянальнай адукацыі беларускага народа, на выніку развіцця беларускай школьнай справы, а таксама вызначыць асаблівасці дзейнасці нацыянальных школ у розных рэгіёнах Беларусі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Напярэдадні польскага наступлення (люты 1919 г.) беларуская школьная справа мела пэўныя дасягненні на тэрыторыі Міншчыны, Віленшчыны і Гродзеншчыны, часткова Магілёўшчыны, дзе ў сувязі з дзейнасцю БНР, беларускіх нацыянальна-дэмакратычных арганізацый нацыянальна-творчыя працэсы адбываліся больш актыўна.

Па прычыне ўсталявання савецкай улады (3 снежня 1918 г.) урад А. Луцкевіча пакінуў беларускую сталіцу і пераехаў у Вільна, а затым у Гродна. Частка беларускіх дзеячаў: В. Іваноўскі, Я. Лёсік, С. Рак-Міхалоўскі, Б. Тарашкевіч, А. Гірконт, Ф. Аляхновіч і інш. – засталася ў Мінску. Яны спадзяваліся, што змогуць разгарнуць беларускую культурную працу ва ўмовах бальшавіцкай улады. Беларуская школьная справа ўяўлялася як дзяржаватворчы фактар, важнейшы для кансалідацыі нацыі і пашырэння нацыянальнай свядомасці сярод мясцовага насельніцтва. Аднак нават ва ўмовах абвяшчэння ССРБ, а потым ЛітБел развіццё беларускай адукацыі не набыло шырокіх маштабаў.

Пытанне аб арганізацыі беларускамоўных школ разглядалася на некаторых мясцовых з'ездах работнікаў асветы, але да практычных вынікаў гэта не прыводзіла. На настаўніцкім з'ездзе Дзісенскага павета, які адбыўся 9–10 студзеня 1919 г., было прынята рашэнне адмовіцца ад арганізацыі беларускіх школ. У пастанове з'езда адзначалася, што "інтэрнацыянальны характар савецкай працоўнай школы не прадугледжвае стварэння вузкіх нацыянальных рамак" [2, а. 10]. Дапускалася, што ў некаторых рускіх школах будзе вывучацца беларуская мова як асобны прадмет.

Архіўныя дакументы сведчаць аб тым, што ў 1918–1919 навучальным годзе губернскія аддзелы народнай адукацыі амаль не мелі паказчыкаў у справе арганізацыі беларускіх школ. Беларускія секцыі былі створаны пры адзінкавых аддзелах народнай адукацыі. Так, у Бабруйску ў чэрвені–ліпені 1919 г. працавала 39 рускіх школ, 16 яўрэйскіх і 1 польская. Ніводнай беларускай школы ў горадзе не існавала. У Мінску з 85 школ было толькі 9 беларускіх, 8 з якіх – з часоў нямецкай акупацыі [3, с. 117].

З наступленнем польскіх войскаў актывізавалі сваю дзейнасць беларускія нацыянальныя палітычныя партыі і арганізацыі на Віленшчыне і Гродзеншчыне. Асаблівую

ініцыятыву праяўлялі Віленская беларуская рада (ВБР) і Цэнтральная беларуская рада Гродзеншчыны (ЦБРГ), якія ўзніклі ў студзені 1919 г.

Правячыя колы Польшчы разумелі, якім важным палітычным крокам з боку Савецкай Расіі было абвяшчэнне ССРБ-ЛітБел. Каб падтрымаць уласны аўтарытэт на акупаванай тэрыторыі, палякі афіцыйна не адмаўляліся ад стварэння беларускай дзяржаўнасці, наадварот, да кастрычніка 1919 г. шырока прапагандавалі ідэю федэрацыі. Беларускія ж нацыянальныя дзеячы і арганізацыі імкнуліся выкарыстоўваць у сваіх мэтах любыя ўступкі польскага ўрада, у тым ліку і ў пытаннях развіцця нацыянальнай адукацыі. У пачатку 1919 г. пад эгідай ЦБРГ быў створаны Беларускі настаўніцкі саюз на чале са старшынёй І. Антонавым.

Раскол у беларускім нацыянальным руху на Гродзеншчыне выразна праявіўся ў маі 1919 г. у сувязі з перамовамі дэлегацыі ЦБРГ з польскімі ўладамі. 10 мая 1919 г. дэлегацыя ЦБРГ на чале з П. Алексюком прадставіла Генеральнаму камісару Ю. Асмалоўскаму мемарыял на польскай мове “Аб палажэнні, аб патрэбах беларускага насельніцтва”. Беларускае прадстаўніцтва спадзявалася, што польскі бок дапаможа вырашыць эканамічныя праблемы краю, дазволіць шырокае самакіраванне і дзейнасць нацыянальных арганізацый, а таксама падтрымае развіццё сеткі беларускіх школ [4, а. 194–195]. Польскія ўлады лічылі беларускі нацыянальны рух слабым і няздольным да самастойных палітычных дзеянняў. Аднак ігнараваць памкненні беларускай эліты да дзяржаватворчасці з’яўлялася небяспечным. Важна было не дапусціць распаўсюджання савецкіх уплываў. Таму палякі паабяцалі вылучыць грошы на развіццё беларускіх школ. Відавочна, што саступкамі ў адукацыйнай сферы яны імкнуліся абмінуць вырашэнне нацыянальнага пытання.

У сучаснай польскай гістарыяграфіі існуе меркаванне аб тым, што беларускія лідары, прыкрываючыся нацыянальным пытаннем, мелі меркантыльныя мэты. Падобная ацэнка была дадзена дзейнасці кіраўніка ЦБРГ П. Алексюка. У пачатку чэрвеня ён атрымаў з Генеральнага камісарыята 30000 марак на арганізацыю беларускіх школ. Аднак польскім уладам не было прадстаўлена ніводнай справаздачы аб тым, куды пайшлі гэтыя грошы. Школьны інспектар ведаў, што Гродзенская рада адкрывае беларускія школы без яго ведама і ставіцца да яго як да інспектара выключна польскіх школ. Таму, калі некаторыя беларускія настаўнікі не атрымалі зарплаты і звярнуліся са скаргамі да Гродзенскага школьнага інспектара, ён пачаў “адпраўляць іх да пана Алексюка” [5, а. 20].

У гэты час адбыўся раскол унутры Беларускага настаўніцкага саюза. У чэрвені 1919 г. арыентаваная на супрацоўніцтва з польскімі ўладамі група на чале з Л. Дзекуць-Малеем прыняла рашэнне звольніць І. Антонава з пасады старшыні, а таксама забараніць яму далей працаваць у пачатковай беларускай школе па прычыне сувязі апошняга з Літоўскай Тарыбай. Вярнуўшыся з Коўна, Антонаў быў арыштаваны за антыпольскую агітацыю, сродкі, якія ён прывёз на арганізацыю беларускіх курсаў, былі канфіскаваныя і перададзеныя школьнаму інспектару. Адначасова адбылася “чыстка” Беларускага настаўніцкага саюза, які перайменавалі ў Беларускую школьную раду Гродзеншчыны (БШРГ) на чале з Дзекуць-Малеем [6, с. 39]. Кіраўніцтва Рады паспрабавала атрымаць канфіскаваныя ў Антонава грошы, аднак школьны інспектар катэгарычна адмовіў, вырашыўшы з гэтага часу трымаць беларускую школьную справу пад уласным кантролем.

Пасля правядзення Беларускага з’езда Віленшчыны і Гродзеншчыны (9–10 чэрвеня 1919 г.) ролю галоўнага палітычнага цэнтра беларускага нацыянальнага руху прыняла на сябе Цэнтральная беларуская школьная рада Віленшчыны і Гродзеншчыны (ЦБШРВіГ), утвораная па ініцыятыве партыі беларускіх эсэраў. У першы склад прэзідыума ўвайшлі К. Дуж-Душэўскі (старшыня), М. Кахановіч, Я. Станкевіч, Б. Тарашкевіч і інш.

Значную ўвагу ЦБШРВіГ надавала развіццю беларускай школьнай справы. Кіраўніцтва беларускімі школамі на тэрыторыі Віленшчыны і Гродзеншчыны даручалася школьнаму аддзелу Рады, начальнікам якога быў назначаны М. Кахановіч. Сярод асноўных накірункаў яго дзейнасці з’яўляліся: арганізацыя сеткі беларускіх школ на Віленшчыне і Гродзеншчыне, распрацоўка навучальных праграм, удзел у разглядзе ўрадавых пастаноў па пытаннях народнай асветы, падрыхтоўка настаўнікаў для беларускіх школ, кантроль за ажыццяўленнем навучання ў беларускіх школах [7, с. 72].

З 25 ліпеня па 3 верасня 1919 г. у Вільні былі арганізаваны І-я Беларускія настаўніцкія курсы, на якія паступілі 154 слухачы [8, а. 125–134]. Агульны курс беларусазнаўства, што ўключаў беларускую мову, літаратуру, гісторыю і геаграфію Беларусі, выкладалі прадстаўнікі ЦБШРВіГ Я. Станкевіч,

М. Кахановіч, К. Дуж-Душэўскі, а таксама В. Ластоўскі, М. Гарэцкі і інш. Гэтыя аўтарытэтныя і вельмі зацікаўленыя ў сваёй справе выкладчыкі моцна паўплывалі не толькі на адукацыйны ўзровень, а, самае галоўнае, на свядомасць курсантаў, якія ў выніку сталі сапраўднымі барацьбітамі за беларускую школу.

У той час, калі былі падрыхтаваныя першыя настаўнікі для Віленшчыны і Гродзеншчыны (верасень 1919 г.), школьны інспектар Віленскай акругі выдаў распараджэнні, якія рэгулявалі арганізацыю беларускіх школ. Умовы адкрыцця беларускіх школ распрацаваў школьны інспектар без удзелу ЦБШРВіГ. Польскія ўлады былі заклапочаныя тым, што аслаблены беларускі рух з дапамогай школ імкнуўся як мага хутчэй стварыць пласт нацыянальнай інтэлігенцыі. Афіцыйна забараніць беларускія школы было небяспечна. Прыхільнікамі федэралісцкай канцэпцыі ўтварэння дзяржавы прапаноўваліся найбольш аптымальныя сродкі для таго, каб схіліць насельніцтва, перш за ўсё беларускую эліту, на бок новай улады і тым самым прадухіліць верагоднасць праяўлення нацыянальна-вызваленчага руху. На І-я Беларускія настаўніцкія курсы ГУУЗ выдзеліла авансам 19000 марак, аднак астатняя частка грошай (27365 марак), якая прадугледжвалася ў каштарысе курсаў, не была выплачана [8, а. 107].

У пачатку верасня 1919 г. 95 выпускнікоў курсаў атрымалі ад Рады “назначэнні”, грошы на дарогу і пасведчанні, якія павінны былі даваць права адкрываць беларускія школы, і раз’ехаліся па паветах Віленшчыны і Гродзеншчыны [8, а. 11–12]. Па распараджэнні начальніка Віленскай акругі за дзейнасцю дадзеных асоб быў арганізаваны спецыяльны нагляд з боку польскай жандармерыі [7, с. 74]. Павятовыя школьныя інспектары і старасты не ведалі, як трэба ставіцца да беларускіх настаўнікаў, бо ніякіх афіцыйных папер і распараджэнняў ад цэнтральнай улады наконт гэтага не паступала. Большасць з выпускнікоў курсаў не была дапушчана да працы ў школах. Тыя, хто насуперак мясцовай адміністрацыі спрабаваў адчыніць беларускія школы, заставаліся без сродкаў да існавання.

У канцы кастрычніка 1919 г. на ІІ-х Беларускіх настаўніцкіх курсах, якія адбыліся ў Вільні, было падрыхтавана яшчэ 233 беларускіх настаўніка для Віленшчыны і Гродзеншчыны [7, с. 82].

Негатыўныя адносіны польскіх улад да развіцця беларускай школьнай справы не спынілі яе арганізатараў. ЦБШРВіГ актыўна дамагалася прызначэння побач з польскімі беларускіх школьных інспектараў. Генеральны камісар Ю. Асмалоўскі паабяцаў дапусціць беларусаў толькі ў якасці памочнікаў школьных інспектараў. Да канца верасня 1919 г. Рада накіравала пяць сваіх кандыдатаў у Гродзенскі, Вілейскі, Сакольскі, Бельскі і Ваўкавыскі паветы [7, с. 84]. З гэтых мясцовасцей у ЦБШРВіГ паступілі 23 сялянскія прыгаворы (рашэнні агульных вясковых сходаў) аб адкрыцці беларускіх школ, у сувязі з чым мясцовая адміністрацыя пачала ўспрымаць беларускіх інспектараў як антыпольскіх агітатараў. ЦБШРВіГ не мела паўнамоцтваў адчыняць школы без дазволу польскай улады. У сваю чаргу, школьны інспектар Віленскай акругі не зацвердзіў ніводнай беларускай школы.

Пасля акупацыі польскімі войскамі Міншчыны ГУУЗ пачало паступовую ліквідацыю беларускіх школ на тэрыторыі Віленшчыны і Гродзеншчыны, прапануючы іх адкрыццё толькі ў Мінскай акрузе. Цэнтр беларускага нацыянальнага руху перамясціўся ў Мінск, а пытанне аб геапалітычнай прыналежнасці беларускіх зямель заставалася адкрытым. Польскія ўлады зноў пачалі абяцаць саступкі беларусам у сферы нацыянальнай адукацыі.

На трэці дзень пасля авалодання Мінскам польскімі войскамі (10 жніўня 1919 г.) быў створаны прадстаўнічы орган беларускіх нацыянальных арганізацый – Часовы беларускі нацыянальны камітэт (ЧБНК). Аснову яго склалі тыя беларускія дзеячы, якія раней працавалі пры савецкай уладзе. Старшынёй камітэта быў абраны А. Прушынскі, яго намеснікам – У. Ігнатоўскі. Паводле свайго статута ЧБНК ставіў на мэце згуртаванне ўсіх беларускіх арганізацый Міншчыны для падняцця нацыянальнай свядомасці, духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа. Пры камітэце стварылі школьную камісію на чале з С. Рак-Міхайлоўскім, што з 30 жніўня 1919 г. была перайменавана ў Беларускую школьную раду Міншчыны (БШРМ) [9, а. 68].

10 верасня 1919 г. БШРМ афіцыйна паведаміла аб пачатку сваёй дзейнасці ў Мінскі магістрат, школьнаму інспектару Мінскай акругі, а затым у Генеральны камісарыят. 16 верасня 1919 г. гарадскія ўлады перадалі БШРМ 27 пачатковых школ і 17 вышэйшых пачатковых школ, большасць якіх мела рускую мову выкладання. Па загадзе польскіх улад, пытанне аб далейшай нацыянальнай прыналежнасці гэтых школ неабходна было пакідаць на рашэнне бацькоўскіх сходаў. У сувязі з гэтым у аддзел асветы магістрата пачалі

паступаць скаргі ад кіраўніцтва, настаўнікаў і бацькоў вучняў рускіх школ, у якіх гаварылася аб тым, што прадстаўнікі БШРМ аказваюць уціск на бацькоў пры вырашэнні пытання аб рэарганізацыі школ у беларускія [10, а. 70]. Таму польскае кіраўніцтва лічыла, што хуткі рост беларускіх школ звязаны перш за ўсё з фармальным пераводам былых рускіх школ на беларускую мову выкладання.

З 20 кастрычніка па 21 лістапада 1919 г. былі праведзены Мінскія беларускія настаўніцкія курсы, на якіх навучалася больш за 200 чалавек. Мэта – перападрыхтоўка працаўнікоў рускіх школ. Таму для атрымання пасведчанняў аб заканчэнні курсаў настаўнікі абавязкова павінны былі вытрымаць экзамен па беларусазнаўстве [10, а. 298]. Большасць настаўнікаў адмовілася ад гэтага экзамена, што магло сведчыць аб недастатковым узроўні іх падрыхтаванасці.

У студзені 1920 г. БШРМ выдала распараджэнне педагагічным радам беларускіх школ, згодна з якім навучанне ў першых класах павінна было праводзіцца толькі па беларускіх падручніках; ва ўсіх класах пачатковых школ беларускую мову трэба было выкладаць па 5–6 гадзін на тыдзень, у вышэйшых пачатковых школах у якасці абавязковых прадметаў уводзіліся гісторыя і геаграфія Беларусі. Апошні пункт распараджэння забараняў настаўнікам размаўляць з вучнямі і паміж сабой не па-беларуску. Дзейнасць БШРМ хутка дала станоўчыя вынікі: ужо ў снежні 1919 г. у Мінску дзейнічала 15 беларускіх пачатковых школ і 3 вышэйшыя пачатковыя школы [10, а. 358–359].

Адносіны польскіх улад да беларускага школьніцтва пагоршыліся з сакавіка 1920 г. Па ініцыятыве Ю. Пілсудскага 20–24 сакавіка 1920 г. у Мінску адбыліся беларуска-польскія перамовы. Польскую дэлегацыю ўзначаліў Лявон Васілеўскі, перад якім была пастаўлена задача ў сувязі з тым, што РСФСР звярнулася да ўрада Польшчы з прапановай аб спыненні ваенных дзеянняў і заключэнні мірнага дагавора, заручыцца падтрымкай беларускіх груповак, выключыўшы палітычныя патрабаванні [7, с. 88]. Беларуская дэлегацыя на перамовах у Мінску налічвала 8 асобаў, сярод якіх былі В. Іваноўскі, Я. Лёсік, кс. А. Станкевіч, А. Смоліч, П. Уласаў, С. Рак-Міхайлоўскі, К. Цярэшчанка і І. Серада. Польскі бок адхіліў усе палітычныя патрабаванні беларускай дэлегацыі, але абяцаў значныя саступкі ў галіне адукацыі і культуры. Палякі (пры ўмелым зніжэнні датацый) абяцалі дазволіць з 1920–1921 навучальнага года ўвядзенне выкладання беларускай мовы як абавязковага прадмета ва ўсіх школах, арганізацыю курсаў па падрыхтоўцы беларускіх настаўнікаў, гарантавалі аўтаномію для беларускай школы.

Большасць мясцовых чыноўнікаў незадаволілі вынікі перамоў, што прывяло да прызначэння новага школьнага інспектарата Мінскай акругі. Польская адміністрацыя на Міншчыне ніводнае са сваіх абяцанняў адносна беларускай школьнай справы не выканала.

У сакавіку з Генеральнага камісарыята быў атрыманы афіцыйны дазвол на аб’яднанне рэгіянальных Беларускіх школьных рад у Цэнтральную Беларускую школьную раду (ЦБШР) на чале з С. Рак-Міхайлоўскім (прадстаўніком ад БШРГ зацвердзілі Л. Дзекуць-Малея, ад БШРВ – Я. Станкевіча). Асноўнымі мэтамі абвяшчаліся арганізацыя беларускіх школ і кіраўніцтва іх дзейнасцю, падрыхтоўка настаўнікаў, забеспячэнне школ беларускімі падручнікамі і навучальнымі дапаможнікамі. Актывізавалася праца па стварэнні павятовых школьных рад, пачаліся праводзіцца беларускія настаўніцкія курсы ў Слуцку. Польскае кіраўніцтва не перашкаджала беларускім імкненням, аднак пільна кантралявала і акрэслівала дазволеныя рамкі.

Праца ЦБШР працягвалася да ліпеня 1920 г. і спынілася з прыходам у Мінск Чырвонай Арміі. Да гэтага часу колькасць беларускіх школ на тэрыторыі ГУУЗ дасягнула 300, дзейнічалі тры беларускія гімназіі – у Слуцку, Вільні, Мінску. Плённа працавалі на беларускую справу кніжныя выдавецтвы: Беларускае выдавецкае таварыства “Веда” ў Вільні, Беларускае школьнае выдавецтва і Беларускае культурна-навуковае таварыства ў Мінску і інш. [9, с. 73].

Выразныя тэндэнцыі для выкарыстання беларускай справы ў якасці інструмента польскай палітыкі рабілі з яе вызначальны фактар у савецкай кампаніі супраць Польшчы. Савецкі ўрад разумеў, што большая частка беларускіх дзеячаў, якія чакалі, што Польшча падтрымае развіццё беларускай дзяржаўнасці, канчаткова страцілі гэтую надзею пасля адыходу польскіх войскаў летам 1920 г. З другім абвяшчэннем ССРБ з’явілася спадзяванне на далейшае развіццё беларускай справы. Стварэнне беларускай дзяржаўнасці патрабавала ўзнікнення адпаведных дзяржаўных устаноў, дзе на пасадах пачалі б працаваць беларускія дзеячы.

Адным з прыярытэтных накірункаў савецкай нацыянальнай палітыкі з’яўлялася сфера народнай адукацыі. З заснаваннем 17 ліпеня

1920 г. Наркамасветы БССР, кіраўніком якога быў прызначаны П.В. Савацееў (ліпень–снежань 1920 г.), стварэнне розных тыпаў навучальна-выхаваўчых устаноў з нацыянальнымі мовамі навучання паўставала як частка дзяржаўнай палітыкі. Яна праводзілася ў адпаведнасці з "Дэкларацыяй аб абвяшчэнні незалежнасці Беларускай ССР" (31 ліпеня 1920 г.), якая прапаноўвала ўстанавіць поўнае раўнапраўе моў (беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай) у стасунках з дзяржаўнымі ўстановамі і ў арганізацыях і ўстановах народнай асветы і сацыялістычнай культуры.

Пры Народным камісарыяце асветы ССРБ 1 жніўня 1920 г. быў створаны Беларускі аддзел. У Мінску яму падпарадкоўваліся 12 беларускіх школ І ступені (66 настаўнікаў) і 1 школа ІІ ступені (12 настаўнікаў). У Слонімскім павеце падчас вераснёўскай эвакуацыі было 7 школ, у Баранавіцкім – 2, у Дзісенскім – 7, у Ігуменскім – 9. Згодна з прыгаворамі, якія паступілі ад насельніцтва, у Дзісенскім павеце патрабавалася арганізаваць 37 беларускіх школ, у Слонімскім – 30, у Баранавіцкім – 14 [11, с. 100].

З канца жніўня ў Ігуменскі павятовы аддзел народнай адукацыі паступіў шэраг заяў ад мясцовых настаўнікаў з просьбамі зацвердзіць беларускія школы, арганізаваныя БШР. Аднак савецкае кіраўніцтва не спяшалася ўзнаўляць дзейнасць беларускіх школ. Настаўнікам, якія не працавалі ў час польскай акупацыі (на Міншчыне гэта былі пераважна настаўнікі рускіх школ), прызначаліся дадатковыя грашовыя выплаты. У выніку большасць работнікаў школ павета адмовілася ад адкрыцця беларускіх школ, гаворачы пра сябе як пра рускіх настаўнікаў, якія не атрымлівалі зарплаты ад польскай улады.

13–17 снежня 1920 г. у Мінску адбыўся ІІ Усебеларускі з'езд Саветаў, які ратыфікаваў дамову аб часовым перамір'і РСФСР з Польшчай і даў паўнамоцтвы Савету Народных Камісараў на правядзенне далейшых перамоў у Рызе. Пытанні беларускай мовы, адукацыі і выдавецкай справы на гэтым з'ездзе не закраналіся. Пасля з'езда ЦВК ССРБ прызначыў Савет Народных Камісараў на чале з А. Чарвяковым, народным камісарам асветы быў выбраны выкладчык Мінскага інстытута народнай асветы прафесар У. Ігнатоўскі. Вакол Народнага камісарыята асветы пачалі групавацца вядомыя беларускія навукоўцы і выкладчыкі – Я. Лёсік, А. Смоліч, М. Доўнар-Запольскі, акадэмік Я. Карскі і інш.

Ідэі нацыянальна-культурнага адраджэння знаходзілі падтрымку ў асяроддзі педагагічнай інтэлігенцыі. Гэта выразна праявілася на губернскім з'ездзе работнікаў народнай асветы, што адбыўся ў Мінску ў канцы снежня 1920 г. На ім разгарнулася спрэчка наконт таго, ці існуюць увогуле беларуская мова і культура. На канчатковыя рашэнні з'езда значна паўплываў даклад вядомага педагога-мовазнаўцы Івана Бялькевіча (выпускніка Свіслацкай семінарыі 1909 г., слухача Віленскіх беларускіх курсаў 1919 г.), які здолеў пераканаць дэлегатаў у тым, што беларуская мова і культура не знікла і мае неабходнасць у падтрымцы з боку дзяржавы і народа [12, с. 3].

Абмеркаванне пытанняў аб развіцці беларускай мовы, адукацыі і культуры на дзяржаўным узроўні ўпершыню адбылося на ІІ Сесіі ЦВК БССР (4 лютага 1921 г.). На неабходнасць звярнуцца да гэтых праблем паўплывалі частыя патрабаванні іх вырашэння з боку беларускіх эсэраў, а таксама ўзмацненне беларускіх уплываў у Сярэдняй Літве і энергічная дзейнасць В. Ластоўскага ў Коўна. Пастанова, прынятая на сесіі, стварала ўражанне аб пачатку сур'ёзнай і шырокамаштабнай беларускай справы. Аддзелам асветы загадвалася тэрмінова пачаць перавод працы ў школах на беларускую мову, павінна была разгарнуцца работа па падрыхтоўцы беларускіх настаўнікаў і пераводзе ў школы педагогаў з іншых працоўных сфер, усе школы ІІ ступені абавязваліся неадкладна ўключыць у праграму навучання беларускую мову як асобны прадмет, актывізавацца павінны былі Дзяржаўнае выдавецтва і літаратурна-выдавецкі аддзел Наркамасветы. Аднак на практыцы пастанова, якая давала вялікія магчымасці для беларускага адраджэння, дзейнічала вельмі павольна. Толькі ў красавіку 1921 г. арганізавалі беларускія настаўніцкія курсы і сталі вывучаць беларускую мову ў асобных школах.

Практычныя крокі насустрач развіццю беларускай культуры і асветы з боку савецкіх улад больш выразна праявіліся толькі вясной 1921 г., калі пры Народным камісарыяце асветы РСФСР было заснавана Беларускае цэнтральнае бюро, якое падпарадкоўвалася Цэнтральнаму савету па асвеце меншасцей. Яго галоўнай задачай з'яўлялася арганізацыя і кіраванне нацыянальнай сістэмай адукацыі ў раёнах кампактнага пражывання беларусаў на тэрыторыі РСФСР, галоўным чынам у Гомельскай, Віцебскай і Смаленскай губернях. На тэрыторыі Гомельшчыны, Віцебшчыны і Магілёўшчыны да сярэдзіны 1922 г. беларускія школы не працавалі, і Наркамасветы БССР не меў рэальнай магчымасці ўплываць на змяненне сітуацыі.

**Заключэнне.** Развіццё беларускіх нацыянальных школ ва ўмовах як польскай, так і са-

вецкай адукацыйнай палітыкі ў 1919–1921 гг. выразна адлюстроўвала адносіны кіраўніцтва РСФСР і Польшчы да пытання аб форме будучай дзяржаўнасці на беларускіх землях. Абодва бакі дэкларавалі стварэнне школ з беларускай мовай навучання, аднак ва ўмовах ваеннага часу (1919–1921 гг.) не было магчымасцей для практычнай дзейнасці ў гэтым кірунку. Адукацыйная праца беларускіх нацыянальных дзеячаў стрымлівалася наступным шэрагам фактараў: размытай этнаканфесійнай ідэнтыфікацыяй мясцовага насельніцтва, адсутнасцю адзінай дзяржаўнасці на ўсёй этнічнай беларускай тэрыторыі, палітычнай раз'яднанасцю беларускага нацыянальнага руху, недахопам уласных фінансавых сродкаў.

Польскі бок аб'ектыўна не быў зацікаўлены ў развіцці нацыянальнай школы беларусаў, якая з'яўлялася крыніцай пашырэння нацыянальнай свядомасці. Пасля афіцыйнага ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад Польшчы (сакавік 1921 г.) адукацыйная палітыка польскіх улад пачала праяўляць асімілятарскую накіраванасць. У паветах праводзіліся ўлік і закрыццё ўсіх беларускіх школ.

У сваю чаргу, крокі савецкага кіраўніцтва, зробленыя насустрач ідэі беларускага нацыянальна-культурнага адраджэння ССРБ, заклалі падмурак будучай палітыкі беларусізацыі.

## Літаратура


1. Трубчык, А.Г. Школьная адукацыя на тэрыторыі Беларусі ў час польска-савецкай вайны (1919–1921 гг.): агляд гістарыяграфіі і крыніц / А.Г. Трубчык // Гісторыка-археалагічны зборнік. Да юбілею з дня заснавання Інстытута гісторыі НАН Беларусі: зб. навук. арт. Вып. 25 / Інстытут гісторыі НАН Беларусі; рэдкал. А.А. Каваленя (гал. рэд.), В.В. Даніловіч (нам. гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 89–96.
2. Протокол учительского съезда Дисненского уезда, 9–10 января 1919 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 766. – Воп. 1. – Спр. 13.
3. Няміга, Г. Школьніцтва ў БССР да разгрому "нацдэмаўшчыны" (1917–1930 гг.) / Г. Няміга // Беларускі зборнік / Інстытут для вывучэння СССР. – Мюнхен, 1995. – Кн. 2. – С. 11–171.
4. Memorjał w sprawie białoruskiej, 1919 r. // НАРБ. – Фонд 541. – Воп. 2. – Спр. 57.
5. Raport w sprawie szkolnictwa białoruskiego, 7.08.1919 // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Фонд 87. – Воп. 2. – Спр. 71.
6. Антонаў, І. Успаміны аб польскай акупацыі Гродзеншчыны ў 1919–1921 гг. / І. Антонаў. – Б.м., 1921. – 83 с.
7. Трубчык, А. Асноўныя накірункі адукацыйнай палітыкі на беларускай тэрыторыі Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх зямель (1919–1920 гг.) / А. Трубчык // Białoruskie Zeczyty Historyczne (Беларускі гістарычны зборнік). Nr. 37 / Białoruskie Towarzystwo Historyczne; red. E. Mironowicz. – Białystok, 2012. – S. 70–90.
8. Справа Беларускіх настаўніцкіх курсаў у Вільні, 1919 г. // НАРБ. – Фонд 878. – Воп. 1. – Спр. 15.
9. Трубчык, А.Г. Школьная адукацыя ў Мінску ў перыяд польска-савецкай вайны (1919–1920 гг.) / А.Г. Трубчык // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2012. – № 3. – С. 67–73.
10. Дело с протоколами заседаний Магистрата г. Минска, август 1919 г. – февраль 1920 г. // Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Фонд 1806. – Воп. 1. – Спр. 4б.
11. Белорусский отдел // Школа и культура Советской Белоруссии. – 1921. – № 1–2. – С. 100.
12. Што робіцца на Беларусі. Рэзалюцыя З'езду работнікаў асветы па беларускаму пытанню // Савецкая Беларусь. – 1921. – 25 лют. – С. 3.


*Паступіў у рэдакцыю 06.04.2016 г.*